(https://shop.beltelecom.by/)

Карэспандэнт «Звязды» выправілася ў рэйд з участковымі

07.12.2017 00:18 **Аўтар: Кацярына Асмыковіч (/be/tags/kacyaryna-asmykovich)** **Грамадства (/be/gramadstva)**

— А вы ведаеце свайго ўчастковага? — пытаецца ў мяне Мікалай ЗЕЛЯНОЎСКІ, старшы лейтэнант міліцыі, намеснік начальніка аддзела правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі УУС адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска. — Не? Відаць, пашанцавала з суседзямі. Бо бываюць дамы, куды нас выклікаюць па некалькі разоў на дзень, каб уціхамірыць буйных грамадзян за сцяной.

Так, «узброіўшыся» фотаапаратам і дыктафонам, карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай Змены» выправілася ў рэйд з участковымі інспектарамі міліцыі, спрабуючы бліжэй пазнаёміцца з гэтай прафесіяй.

(h



— Калі ласка, адпусціце нас. Гэта першы раз, мы больш так не будзем, — рыдаючы, амаль хорам просяць тры дзяўчынкі-падлеткі.

— Калі я вас адпушчу сёння, дык заўтра сустрэну ў іншай кампаніі з чым-небудзь мацнейшым па градусах, — кажа Мікалай.

У той вечар 15-гадовыя прыгажуні ў адным са сталічных двароў «ласаваліся» чатырма літрамі моцнага піва.

— Мы абяцаем, што больш такога не паўторыцца, — не супакойваюцца школьніцы. — А бацькам раскажаце, што мы рабілі?

— Дзяўчаты, не трэба плакаць. Зараз адвядзём вас у апорны пункт, прыедзе інспектар па справах непаўналетніх, і вы яму ўсё растлумачыце, — уступае ў гутарку **Ганна МАКАРЭВІЧ, старшы лейтэнант міліцыі, участковы інспектар.**

Праваахоўнікі кажуць, што інцыдэнты з дзецьмі і падлеткамі заўсёды вылучаюцца сярод іншых сваёй эмацыянальнасцю. Пры гэтым няважна, пацярпелыя яны або правапарушальнікі.

— Вы павінны нас зразумець, — працягваюць ціснуць на жаль дзяўчаты. — Вы ж самі нядаўна ў такім узросце былі!

— Былі, але так сябе дакладна не паводзілі, — адказвае Мікалай.

Мае «калегі» прызнаюцца, што на малады ўзрост людзей у форме ўвага звяртаецца часта.

— Нярэдка даводзіцца разбірацца ў сямейных канфліктах людзей, якім за 40. Але мала хто абураецца, маўляў, маладая, зялёная, чаго жыццю вучыш, — тлумачыць Ганна. — Калі грамадзяне звяртаюцца ў міліцыю, значыць, вырашыць самастойна праблемы яны ўжо не могуць. Нават са сваім жыццёвым досведам.

— Адказнасці на пасадзе, асабліва калі ў цябе ёсць падначаленыя, шмат. Тым больш у 28 гадоў, — кажа Мікалай. — Я, прынамсі, так лічу. Разумею, ёсць моманты, дзе мне не хапае вопыту, але ўсё ведаць таксама немагчыма. Ніхто мне ніколі не казаў: «Ты начальнік, ты і вырашай». Старэйшыя калегі заўсёды дапамогуць: справай ці словам.

* * *

Мікалай у міліцыі з 2010 года. Хлопец працаваў у патрульна-паставой службе, быў участковым інспектарам.

— Пачыналася ўсё з добраахвотнай дружыны па ахове грамадскага парадку. Уступаць у шэрагі дружыннікаў можна было толькі паўналетнім, таму ў свае 16 гадоў я хадзіў побач з міліцыянерамі і глядзеў, што з сябе ўяўляе служба ўчастковага, — дзеліцца Мікалай. — А ў 18 гадоў працягнуў працаваць афіцыйна. Скончыў Інстытут упраўлення і прадпрымальніцтва па спецыяльнасці «прававое забеспячэнне прадпрымальніцкай дзейнасці».

Мікалай кажа, што бацькі заўсёды ведалі пра яго жаданне служыць у органах, падтрымлівалі.

— Сёння, праўда, рэакцыя ў іх на службу крыху іншая, чым была спачатку. Справа ў маім працоўным графіку, з-за якога не ўдаецца шмат часу праводзіць з сям'ёй. Матуля зразумела ступень небяспекі, з якой яе сын сутыкаецца кожны дзень. Зараз ужо, на гэтай пасадзе, рызыка меншая, — усміхаецца Мікалай. — А вось Ганна заўсёды на «перадавой».

Дзяўчыне 25 гадоў, яна працуе ў міліцыі два з паловай гады.

(h



— Да службы ў міліцыі каля двух месяцаў выкладала ў школе беларускую мову. — Скончыла педагагічны ўніверсітэт. Падчас вучобы вырашыла атрымаць другую вышэйшую адукацыю, паступіла ў Акадэмію МУС, — расказвае Ганна.

Служба, як прызналася сама дзяўчына, «зацягнула».

— У мяне тата раней ва ўнутраных войсках служыў. Не раз папярэджваў, што хлеб гэта нялёгкі, але ніколі не адгаворваў. Ды і ўвогуле адразу пра ўсе падводныя камяні не раскажаш, — лічыць суразмоўца. — Толькі ўласны досвед можа расставіць нейкія акцэнты.

— Дзе жывяце? У гэтым раёне? — пераключаецца на «затрыманых» Ганна.

— Так, — амаль шэптам адказваюць дзяўчаты, неахвотна ідучы да апорнага пункта міліцыі.

— Бацькі ведаюць, дзе вы зараз знаходзіцеся? Што вы ім сказалі?

— Мы не думалі, што так атрымаецца… Што зараз будзе?

— Разумееце, у мяне бацька п'е, мама заўсёды плача. Яна ўвогуле шмат працуе, каб нас пракарміць, — разгаварылася адна з дзяўчат. — Тата нам усё жыццё сапсаваў! Не кажыце матулі, што я так, як ён, раблю. Яна гэтага не перажыве.

Прызнаюся, прыгожых дагледжаных дзяўчат было шкада.

— Лічыце нас занадта строгімі? — звяртаецца да мяне Мікалай. — Я не першы год працую і магу з упэўненасцю сказаць, што такія «банкеты» яны арганізуюць перыядычна. Як думаеце, падзякуюць бацькі ўчастковым, што тыя іх дзяцей затрымалі? Сумняваюся. Хутчэй за ўсё будуць казаць, што дочкі — святыя.

* * *

— Маё першае дзяжурства ў патрульна-паставой службе прайшло адносна спакойна: раніцай заўсёды цішэй. «Пагуляў» восем гадзін на свежым паветры і пайшоў дадому. Памятаю, як «даставаў» старэйшага калегу пытаннямі. Ён, праўда, усё цярпеў. Тут яшчэ невядома, для каго гэты дзень быў экзаменам, — успамінае Мікалай. — У працы ўчастковага шмат залежыць ад спецыфікі раёна.Там, дзе размешчаны розныя арганізацыі і гандлёвыя цэнтры, цішэй. А вось спальныя раёны — Малінаўка, Паўднёвы Захад — «схільныя» да правапарушэнняў, якія часцей за ўсё здзяйсняюць нецвярозыя людзі.

Увогуле, ні для каго не сакрэт, што большая частка злачынстваў адбываецца ў стане алкагольнага ап'янення. Таму мае суразмоўнікі раяць заўсёды праяўляць актыўную грамадскую пазіцыю. «Бачыце падазроную кампанію — паведаміце пра гэта ў міліцыю. А мы ўжо праверым», — дадае Мікалай.

— Як прыйшла ў міліцыю, стала часцей заўважаць, што людзі парушаюць грамадскі парадак. Часам можна было б і міма прайсці: калі не на службе і не ў форме. Але нешта ўнутры спрацоўвае, і ты робіш заўвагу, — дадае Ганна.

(h



Дарэчы, пра форму. Суразмоўніца кажа, што да дзяўчат у «мужчынскай прафесіі» прыглядаюцца больш. Маўляў, ці сапраўды гэтае «дзіця» зможа справіцца са сваімі функцыямі?

— У першую чаргу форма абавязвае да акуратнасці, прычым ва ўсім: у вонкавым выглядзе, словах, паводзінах, — лічыць Ганна. — Але жаноцкасці ў дзяўчат-міліцыянераў хапае, не хвалюйцеся! Яна нават набывае нейкую адмысловую афарбоўку!

Ганна і Мікалай кажуць, што для маладога супрацоўніка вельмі важна трапіць у такі апорны пункт, дзе добры старшы ўчастковы.

— Калі ёсць каманда, прасцей выконваць усе задачы. Але пры гэтым ніколі не ўзнікае нейкіх пытанняў наконт асабістага. Служба ёсць служба. На рабоце мы — калегі, па-за сценамі міліцыі — сябры, — тлумачыць Мікалай. — Ходзім адзін да аднаго ў госці, разам адзначаем святы.

Але, адразу папярэджваюць мае суразмоўнікі, працу дадому яны «не носяць».

* * *

— У вас тут чыста і неяк нават утульна стала, — кажа Ганна, заходзячы ў адну з кватэр, якая мае рэпутацыю прытона.

— Ну, зразумела, я ж кінуў піць, — ганарліва адказвае 50-гадовы гаспадар жылля.

— А хто ў тым пакоі «адпачывае»? — заўважае ў зале постаць Мікалай.

— Дык гэта ж брат мой! — падхопліваецца мужчына.

— А брат не перастаў піць? — удакладняе Ганна.

— Не, але ён стаў цішэйшы ў «гэтых справах». Я ў асноўным сплю, калі ён прыходзіць…

— Калі брат лячыцца пачне?

— Зараз групу па інваліднасці яму працягваць будуць, можа, тады і пакладуць лячыцца, — з сумам кажа гаспадар кватэры.

У Ганны пад кантролем 11 дамоў. Дзяўчына кажа, што свой «падсправаздачны кантынгент» яна ведае добра. Але паасобку «такіх грамадзян» участковыя ўсё роўна не наведваюць.

— Падчас службы ў міліцыі я навучылася кантактаваць з людзьмі і больш кантраляваць сябе эмацыянальна. А кантынгент тут, паверце, розны, — кажа Ганна.

— Праца вучыць нават свае невялікія сямейныя канфлікты спускаць на тармазах. Псіхалогія! У міліцыі без гэтага ніяк, — усміхаючыся, дадае Мікалай. — Увогуле, жонкам супрацоўнікаў трэба аддаць належнае. Яны з намі «сваю службу» нясуць!

Падзяку, як прызнаюцца ўчастковыя, яны чуюць рэдка. У асноўным — ад людзей, якія ў міліцыі «госці» нячастыя.

— Працавалі на Дні Перамогі. Сям'я пайшла ў кінатэатр і пакінула адчыненым акно ў аўтамабілі. На сеанс мабільныя тэлефоны грамадзяне не ўзялі. Каля гадзіны мы «ахоўвалі» маёмасць, а месца было ажыўленае. Сям'я за пільнасць нам была вельмі ўдзячная, — прыгадваюць мае суразмоўнікі.

Мікалай прызнаецца, што вельмі не хоча, каб да міліцыі ставіліся як да нейкага карнага органа:

— Не падабаецца, калі бацькі кажуць дзецям: «Вось будзеш няправільна сябе паводзіць — цябе забярэ дзядзька міліцыянер, пакарае». Малых, наадварот, павінны вучыць, што супрацоўнік міліцыі — гэта той чалавек, да якога неабходна звяртацца па дапамогу!

Кацярына АСМЫКОВІЧ

asmykovich@zviazda.by (mailto:asmykovich@zviazda.by)

Загаловак у газеце: Калі абавязак — дапамагаць

(https://zviazda.by/) Чытайце таксама

Таццяна Дзмітрусёва — незаслужана забытая беларуская паэтка 80-ых гадоў (/be/news/20220130/1643538475-taccyana-dzmitrusyova-nezasluzhana-zabytaya-belaruskaya-paetka-80-yh-gadou)

Ад стагоддзя да стагоддзя. «Чырвонка. Чырвоная змена» святкуе свой стагадовы юбілей (/be/news/20210420/1618929863-ad-stagoddzya-da-stagoddzya-chyrvonka-chyrvonaya-zmena-svyatkue-svoy)

Звязда запускае віктарыну «Гісторыя газеты — гісторыя моладзі» (/be/news/20210310/1615392765-zvyazda-zapuskae-viktarynu-gistoryya-gazety-gistoryya-moladzi)

Чацвёртакурснік БДУ Мікіта Баравік перамог на Рэспубліканскай студэнцкай алімпіядзе па кітайскай мове (/be/news/20210310/1615391643-chacvyortakursnik-bdu-mikita-baravik-peramog-na-respublikanskay-studenckay)

Ступень доктара навук летась атрымалі 40 чалавек, а кандыдата навук - 307 (/be/news/20210310/1615391252-stupen-doktara-navuk-letas-atrymali-40-chalavek-kandydata-navuk-307)

Тэгі: Чырвоная змена (/be/tags/chyrvonaya-zmena-0) | беларуская міліцыя (/be/tags/belaruskaya-milicyya)

1630 праглядаў Русский (/ru/news/20171207/1512635241-korrespondent-zvyazdy-otpravilas-v-reyd-s-uchastkovymi) Друкаваная версія (/be/print/121602)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20171206%2F1512569924-karespand
(https://connect.ok.ru/offer?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20171206%2F1512569924-karespanc
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%9A%D0%B0%D1%80%D1%8D%D1%81%D0%BF%D0%B0%D0%BD%D0
(viber://forward?text=%D0%9A%D0%B0%D1%80%D1%8D%D1%81%D0%BF%D0%B0%D0%BD%D0%B4%D1%8D%
(https://t.me/share/url?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20171206%2F1512569924-karespandent-z

Навіны | Папулярнае

14:07 Пры пажары ў Свіслачы загінулі гаспадар кватэры і яго госць (/be/news/20231018/1697609734-pry-pazhary-u-svislachy-zaginuli-gaspadar-kvatery-i-yago-gosc)

13:53 У Астраўцы ўзяты пад варту кіроўца, які ў п'яным выглядзе здзейсніў наезд на пешахода (/be/news/20231018/1697626435-u-astraucy-uzyaty-pad-vartu-kirouca-yaki-u-pyanym-vyglyadze-zdzeysniu-naezd)

13:38 Святлафоры часова адключаць на двух участках у Мінску (/be/news/20231018/1697625511-svyatlafory-chasova-adklyuchac-na-dvuh-uchastkah-u-minsku)

13:20 Работа сталічнага гарадскога пасажырскага транспарту 6-7 і 11 лістапада (/be/news/20231018/1697624417-rabota-stalichnaga-garadskoga-pasazhyrskaga-transpartu-6-7-i-11-listapada)

12:57 Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя па інтэлектуальнай уласнасці адкрылася ў Мінску (/be/news/20231018/1697623053-mizhnarodnaya-navukova-praktychnaya-kanferencyya-pa-intelektualnay)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Якія навагоднія песні вы ведаеце? (/be/news/20181226/1545771701-yakiya-navagodniya-pesni-vy-vedaece)

Майстар-клас: навагодні вянок сваімі рукамі (/be/news/20171221/1513870009-maystar-klas-robim-navagodni-vyanok-svaimi-rukami)

Зберагчы дзяцінства, або як сёння змагаюцца з педафіліяй (/be/news/20201201/1606835720-zberagchy-dzyacinstva-abo-yak-syonnya-zmagayucca-z-pedafiliyay)

Маёр міліцыі Андрэй Абрамовіч: Мая задача як бацькі — выхаваць дзяцей добрымі людзьмі (/be/news/20200728/1595948881-mayor-milicyi-andrey-abramovich-maya-zadacha-yak-backi-vyhavac-dzyacey)

«Жанчына ў пагонах заўсёды застаецца дамай!» (/be/news/20200303/1583254809-zhanchyna-u-pagonah-zausyody-zastaecca-damay)

(https://shop.beltelecom.by/)

Выбар рэдакцыі

Грамадства (/be/gramadstva) (/be/news/20231017/1697562752-pershae-pracounae-mesca-dlya-usih-shto-dae-vypuskniku-status-maladoga)

Першае працоўнае месца — для ўсіх. Што дае выпускніку статус маладога спецыяліста? (/be/news/20231017/1697562752-pershae-pracounae-mesca-dlya-usih-shto-dae-vypuskniku-status-maladoga)

Паказчык размеркавання выпускнікоў установ адукацыі дасягае ў апошнія гады практычна 100 працэнтаў.

0 520

Грамадства (/be/gramadstva) (/be/news/20231017/1697561062-yak-pakormish-tak-i-nadoish-u-kancy-sezona-agraryi-ne-zbaulyayuc-tempau)

Як пакорміш — так і надоіш. У канцы сезона аграрыі не збаўляюць тэмпаў (/be/news/20231017/1697561062-yak-pakormish-tak-i-nadoish-u-kancy-sezona-agraryi-ne-zbaulyayuc-tempau)

Палявыя работы.

0 609

Грамадства (/be/gramadstva) (/be/news/20231017/1697554842-tradycyynym-syameynym-kashtounascyam-asablivaya-uvaga-chleny-saveta)

Традыцыйным сямейным каштоўнасцям — асаблівая ўвага. Члены Савета Рэспублікі правялі прамыя тэлефонныя лініі (/be/news/20231017/1697554842-tradycyynym-syameynym-kashtounascyam-asablivaya-uvaga-chleny-saveta)

Члены Савета Рэспублікі правялі прамыя тэлефонныя лініі па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і.

0 513

Калейдаскоп (/be/kaleydaskop) (/be/news/20231013/1697206071-pra-10-zvychak-shchaslivyh-lyudzey-raskazvae-psiholag)

Пра 10 звычак шчаслівых людзей расказвае псіхолаг (/be/news/20231013/1697206071-pra-10-zvychak-shchaslivyh-

(https://zviazda.by/be/psiholag)

Прыміце для сябе адну ісціну — памыляюцца ўсе.

0 1466

Нашы партнёры:

(http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://www.belros.org/) (http://ww

(/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2023 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

8 006
5 950
5 753
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://www.instagram.com/zviazda.by/)